**Галіна Тварановіч,** ***Пад небам Айчыны. Літаратурна-крытычныя артыкулы***, Wydawnictwo Uniwersytetu w Białymstoku, Беласток 2005, сс. 281

Нягледзячы на ўсе складанасці развіцця ў Польшчы гуманістычных навук і асабліва славістыкі, польская беларусістыка ў апошнія паўтара-два дзесяцігоддзі, калі здавалася ўжо, што беларусістыка "выдыхаецца", набірае выразны разгон. Плённа працуюць беларусазнаўчыя асяродкі ў Варшаве, Вроцлаве, Любліне, Ольштыне, Аполе і, мабыць, асаблівай увагі заслугоўвае тут Беласток з яго спрадвечнымі беларускімі этнічнымі, культурна-духоўнымі традыцыямі. Дастаткова згадаць знакавыя для беларускага пісьменства і духоўнасці Супрасль, Заблудаў ці Бельск, у якім ладзіліся соймы Вялікага княства Літоўскага. На працягу ўсяго XX стагоддзя мелі месца спробы стварэння сур'ёзнага беларусазнаўчага цэнтра ў Беластоку. Ды, на жаль, толькі ў 1992 годзе нарэшце ўзнікла кафедра беларускай філалогіі ва універсітэце ў Беластоку. Напачатку пераважная ўвага аддавалася мовазнаўчай праблематыцы, аднак з прыходам на кафедру доктара габілітаванага Галіны Тварановіч належнае месца заняло і літаратуразнаўства.

Да 1999 года праф. Г. Тварановіч амаль дваццаць гадоў з'яўлялася навуковым супрацоўнікам Інстытута літаратуры НАН Беларусі; даследавала ў асноўным беларускую і паўднёваславянскія літаратуры ў параўнальным аспекце. Аб чым і сведчаць яе манаграфіі: "Нравственный мир героя. Белорусская и югославская военная проза 60–70 годов", Минск 1986; "Пакутаю здабыты мір. Тыпалогія характару ў беларускай і славенскай прозе", Мінск 1991; "Беларуская літаратура: паўднёваславянскі кантэкст (Адзінства генезісу, тыпаў літаратур і характар узаемасувязей", Мінск 1996. Новая кніга Г. Тварановіч з'яўляецца вынікам надзвычай шырокага, паглыбленага вывучэння айчыннай літаратуры – ад старабеларускай праз XIX ст. да даследавання навейшых творчых з'яў і фактаў, якія ўзбагачаюць літаратурны працэс, прыдаюць яму дынаміку. Акрамя таго значную пазнавальна-інтэрпрэтацыйную цікавасць маюць у кнізе артыкулы, прысвечаныя важным з'явам сербскага пісьменства. Трэба падкрэсліць, што кніга гэта мае выразную светапоглядную дамінанту. Даследчыца, як адна з нешматлікіх навукоўцаў-гуманітарыяў, паслядоўна "вывярае" мастацкую значнасць як даўніх, так і сучасных твораў, не толькі з пункту погляду эстэтычных вартасцей, але і крытэрыем духоўных каштоўнасцей хрысціянскага вопыту. Бо, як лічыць Г. Тварановіч, *нічога (...) актуальней, універсальней за яшчэ старазапаветныя дзесяць за-*

*паведзей, а таксама праграмы-поклічу да ўзрастання ў духоўных магчымасцях, выказанай у Нагорнай пропаведзі Хрыстом, чалавецтва дасюль не вынайшла* (37).

Думаецца, цалкам невыпадкова тое, што кніга адкрываецца артыкуламі "Песня пра зубра" Міколы Гусоўскага і сучаснасць" і "Отечества и веры защитник. "Записки янычара" Константина Михайловича в польско-белорусском контексте (XV–XVI вв.)". Патрыятызм, любоў да Радзімы, вернасць этнічным і хрысціянскім ідэалам, уласцівыя гэтым творам, бачацца своеасаблівым ідэйна-пафасным ключом і да астатніх матэрыялаў. І, відаць, няма ў гэтым выпадковасці, бо, на жаль, галоўны пафас твораў Міколы Гусоўскага і Канстанціна Міхайловіча ў сацыяльна-палітычным плане застаецца актуальным да нашага часу. У гэтых творах канцэнтруюцца таксама шматлікія праблемы як бы чыста літаратуразнаўчага характару, якімі беларуская літаратура да канца XIX стагоддзя была шчодра "абдзелена" і якія даследчыкам да гэтага часу прыходзіцца вырашаць і даказваць, – найперш праблему паходжання аўтара ды пытанне пра сутнасны аспект нацыянальнага духу, выяўленага ў тых помніках культуры, не зважаючы на фактычную іх мову.

З гэтымі двума артыкуламі арганічна спалучаецца і яшчэ адзін, не менш важкі па пастаноўцы шырокага спектра не толькі літаратуразнаўчых праблем і іх высвятленню, заход даследчыцы ў даўно мінулае ("На шляхах даўняй беларускай літаратуры"). *З'яўляючыся неад'емнай часткаю агульнаеўрапейскага кантэксту*, – як вызначае Г. Тварановіч, – *беларуская літаратура ўзнікла ў рэчышчы славянскага культурна-гістарычнага тыпу, як своеасаблівай цэласнасці з унікальнымі творчымі, рэлігійнымі, сацыяльна-эканамічнымі ўмовамі развіцця*" (47). Аднак зноў жа ў сілу неспрыяльных для беларусаў гістарычных абставін, як вынікае з прыведзенага матэрыялу, даводзіцца толькі цяпер як бы нанава вяртацца да таго часу, збіраць па крупіцы часткі вялікага беларускага пано, рэстаўрыраваць тую культурна-духоўную спадчыну, якая сваёй назапашанай, акумуляванай энергіяй даўно павінна сваім бляскам асвятляць шляхі развіцця беларускай нацыі.

Навейшая гісторыя беларускай літаратуры, пачатая на зломе XIX і XX стагоддзяў, пазначана драматычнымі падзеямі рэвалюцый, сталінскімі рэпрэсіямі, "тэорыяй" зліцця нацый, урэшце стратай свайго статусу тытульнай мовы і гістарычнай атрыбутыкі беларусаў. З гэтага фатальнага "фабульнага" шэрагу другая сусветная вайна пакінула ці не найглыбейшы след і доўга, відаць, яшчэ будзе прадметам навуковых спрэчак не толькі гісторыкаў, але і літаратуразнаўцаў. Г. Тварановіч прапануе свой падыход да асэнсавання беларускай літаратуры ваеннага часу ("Беларуская літаратура ваеннага часу. 1941–1945: новае прачытанне"). Канцэптуальная навізна заключаецца ў поглядзе, што айчынная вайна была на землях беларускіх у значнай ступені і вайной грамадзянскай. Проза і паэзія гэтага перыяду разглядаюцца даследчыцай менавіта ў гэтым ракурсе. Яскравым прыкладам новага погляду на падзеі вайны з'яўляецца ўласна ўпершыню праведзены аналіз паэмы Зм. Астапенкі "Эдэм".

У 30-х гадах мінулага стагоддзя пад прэтэкстам ідэйнага паяднання літаратурна-мастацкіх арганізацый у імя пабудовы новага грамадства і выхаван-

ня савецкага чалавека была створана, як вядома, адна для ўсіх пісьменніцкая іерархічная структура – з адным манапольным цэнтрам кіравання і падпарадкаванымі яму абласнымі (перыферыйнымі) асяродкамі. Канцэпцыя цэнтралізацыі творча-пісьменніцкай арганізацыі аказалася блізкай па духу і літары савецка-беларускаму літаратуразнаўству. "Перыферыйны" творца прынцыпова не мог быць таленавіцейшы за свайго "метрапольнага" сабрата, які хаця б па месцу жыхарства належаў да "цэнтра". Гэтая савецка-беларуская дыхатамія, на жаль, не выкаранена цалкам з ужытку і па сённяшні дзень.

Не ўваходзячы ў тэарэтычна-метадалагічныя спрэчкі з такой канцэпцыяй, Г. Тварановіч падымае ў сваёй кнізе ўсё яшчэ дастаткова плывучы, не ўгрунтаваны ў літаратурным працэсе якраз "перыферыйны" матэрыял – каб паказаць ягоную арганічную знітаванасць з перспектыўнымі шляхамі развіцця беларускага прыгожага пісьменства і выявіць прытым мастацкую самаідэнтыфікацыю такіх "перыферыйных" твораў. Вось чаму значнае месца займае ў даследаваннях Г. Тварановіч шматбаковае асэнсаванне як творчасці, так і самой асобы аднаго з найталенавітых прадстаўнікоў беларускай эміграцыі Масея Сяднёва. Напрыканцы другой сусветнай вайны ён, як вядома, амаль год правёў на Беласточчыне, назваўшы яе і сваёй другой радзімай, і першай прапіскай на захадзе. Аб гэтым М. Сяднёў раскажа ў рэтраспектыўным "Беластоцкім сшытку" (1991 г.), значна актывізуючы гэтай публікацыяй развіццё аўтабіяграфічнага жанру на радзіме, выяўляючы – што падкрэслівае даследчыца – псіхалогію неагрэсіўнай распалавіненасці паміж дзвюма айчынамі той часткі беларускай эміграцыі, якая ў глыбінях душы засталася вернай свайму, карэннаму, праваслаўнаму ў атачэнні англасаксонскай культуры.

У артыкуле "Духоўная паэзія Масея Сяднёва", прысвечаным разгляду яго паэтычнай творчасці з выразнай дамінантай рэлігійнага светабачання, даследчыцца, зыходзячы, відаць, з тонкіх назіранняў багаслова У. Лоскага, сама выказвае філасофска-хрысціянскае меркаванне, што творы такога кшталту, такой тэматыкі "адрозніваюцца ад іншых паэтычных тэкстаў" (161); яны ўзнікаюць па прынцыпу жанра малення, калі на грунце пержытага, чалавечай жыццёвай вопытнасці ўзрастае "з цела душэўнага цела духоўнае" (Першае Пасл. Паўла Кар., 15:44).

І яшчэ ў адным, эсэістычным, матэрыяле ("У вогніве духу паэта") Г. Тварановіч характарызуе творчасць яркага беларускага паэта і празаіка. На гэты раз яго эстэтычна-літаратурныя погляды, філасофскія развагі аб жыцці наогул і ў прыватнасці аб сваім, як яму ўсё здавалася, далёка не ўладкаваным на эміграцыі, нейкае метафізічна-балючае шкадаванне непражытага, таго, што не адбылося; рэфлексіі аб дружбе, прыродзе, смерці і адначасова амаль рэальныя спробы дагнаць час здзяйсненняў на радзіме, уключыцца ў жывы літаратурны працэс – усё гэта паказана даследчыцай праз эпісталярную спадчыну, якая засталася ёй з доўгай перапіскі ў 90-х гадах з пісьменнікам.

Сёння беларуская эміграцыя ўраз з адыходам Н. Арсенневай (1997), М. Сяднёва (2001), Я. Юхнаўца (2004), а яшчэ раней і А. Салаўя (1978) страціла, здаецца, дарэшты свой творчы патэнцыял. Па-за межамі Беларусі застаўся адзін творчы асяродак менавіта на Беласточчыне, дзе – як трапна сцвярджае Г. Тварановіч – "Беларускі літаратурны час працягваецца" (281).

Тут менавіта працягваецца-прадаўжаецца разгортванне таго творчага патэнцыялу беларускай нацыі, які адным з першых буйна выявіў Мікола Гусоўскі, радавод якога некаторыя даследчыкі выводзяць з нашай "зубрынай" Беласточчыны.

І цалкам зразумела, чаму значнае месца ў кнізе Г. Тварановіч займае яшчэ адна нібы "перыферыйная" з'ява – "белавежская" тэматыка. Беларускія пісьменнікі Польшчы, згуртаваныя амаль паўвеку ў літаратурным аб'яднані "Белавежа", як бы неўпрыкмет сабе і ўжо напэўна перамагаючы ўнутраныя і знешнія неспрыяльныя для нацыянальнай меншасці палітычна-грамадскія абставіны, сталі аўтарамі шэрагу арыгінальных твораў. У асобе Г. Тварановіч "Белавежа" мае аднаго са сваіх хранолагаў і гісторыкаў літаратуры. У артыкулах "Насуперак тузе, самоце", "Гісторыя любові да Радзімы", "Паэтыка верша Уладзіміра Гайдука", "Агульныя стылёва-эстэтычныя асаблівасці беларускай літаратуры ў Польшчы", "Мой твар запісаны кірыліцай" робіцца істотная спроба паглыбіцца ў нацыянальна-культуровы феномен "Белавежы", асэсавання яе месца ў агульным беларускім літаратурным працэсе. Даследчыца разглядае асобныя творчыя індывідуальнасці, у прыватнасці вылучае і аналізуе хрысціянскія акцэнты ў аўтабіяграфічнай аповесці Я. Жамойціна, дапамагае нам лепш зразумець структурныя адметнасці стылістыкі ў вершах У. Гайдука, Ю. Баены, а таксама Зніча і інш.

Асноўныя раздзелы кнігі Г. Твaрановіч дапаўняюць і ўзбагачаюць субтэльныя літаратуразнаўчыя эцюды-рэцэнзіі.

*Ян Чыквін*
*Беласток*